


ЧЫМ ЗДЗІВІЦЬ "ФАКТАР.BY"

5

ГІСТОРЫЯ ПЕРАДНАВАГОДНЯГА ЦУДА

13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

23 СНЕЖНЯ 2022 г. ПЯТНІЦА № 252 (29874)

## КОРАТКА

• Даручэнне Прэзідэнта выканана. «Гарызонт» пачаў масавы выпуск і продаж ноўтбукаў.

• **Амаль 30 мемарыяльных дошак адкрылі ў Гомельскай вобласці ў 2022 годзе.**

• Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі прапануе абмеркаваць змены ва ўказ аб удасканаленні жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Свае заўвагі і прапановы можна выказаць у спецыяльнай тэме на Прававым форуме з 21 да 30 снежня.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей БАРТАШ, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці:**

*«Пытанне патрыятычнага выхавання — адно з самых галоўных: пасля развалу Савецкага Саюза беларуская дзяржава з багатай гісторыяй, культурай, традыцыямі, традыцыйнымі каштоўнасцямі стала аб'ектам гібрыдных, у тым ліку інфармацыйна-псіхалагічных нападаў звонку. Метад у нашых праціўнікаў адзін — насаджванне ілжывых арыенціраў. Калі ў савецкі час фізічныя межы дзяржавы дапаўняліся інфармацыйнымі і палітычнымі бар'ерамі, якія баранілі ад уплыву Захаду, то ў перыяд беспрэцэдэнтнай эканамічнай адкрытасці да нас хлынулі заходнія каштоўнасці і культура спажывання. Чужыя мадэлі ўладкавання грамадства былі ледзь ці не ўзведзены ў культ. Дэмаралізаванае грамадства раўназначна разброенай арміі. І ў гэтым ёсць галоўны разлік нашых праціўнікаў. Таму патрыятычнае выхаванне з'яўляецца сёння адной з найважнейшых дзяржаўных задач. Патрыятызм дае сілы на стваральную працу ў інтарэсах асобы, грамадства, дзяржавы».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Хочаш міру — рыхтуйся да вайны»

## Прэзідэнт адказаў на чуткі вакол ваенных манеўраў у Беларусі

**Сітуацыю вакол Беларусі, пагрозы і выклікі нацыянальнай бяспецы абмеркавалі на нарадзе Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з ваенным і сілавым блокам. На парадку дня — вынікі праверкі функцыянавання дзяржаўнай сістэмы рэагавання.**

«Хочаш міру — рыхтуйся да вайны. Не мною прыдумана і не вамі таксама. Гэтым самым я хачу адказаць на рознага роду чуткі, якія з'яўляюцца ў нашым грамадстве, і асабліва ў інтэрнэце, як у сметніцы, наконт перамяшчэння Узброеных Сіл Беларусі і перамяшчэння Узброеных Сіл Беларусі і Расіі. Яшчэ раз хачу нагадаць: у нас створана, згодна з даўняй дамовай з Расійскай Федэрацыяй, сумесная групоўка для сумеснага рэагавання на пагрозы нашаму Саюзу. Мы праводзілі і праводзім трэніроўкі. Цяпер яны ў сілу існуючай сітуацыі і пагроз больш маштабныя. Таму мы на сваёй тэрыторыі праводзім вучэнні, перамяшчаем туды, куды лічым патрэбным, і сумесную групоўку Узброеных Сіл, і свае Узброеныя Сілы. Кропка. Ніякай іншай задумы. Ніякай канспіралогіі. Усё, як я сказаў», — з надзённага пачаў нараду кіраўнік дзяржавы.

СТАР. 2



Фота БелТА.




Рабі, як мы!

# У ЦЯЦЕРЫНЕ ШКОДНЫМ ЗВЫЧКАМ СКАЗАЛІ «НЕ»

**Быць здаровым сёння — справа не толькі асабістая, але і дзяржаўная. Гэты момант агаворваецца ў Канстытуцыі Беларусі, а міжнародная ініцыятыва «Здаровыя гарады і пасёлкі», як заявіў на адным з Усебеларускіх народных сходаў Прэзідэнт, павінна перарасці ў маштабны дзяржаўны праект.**

У Магілёўскай вобласці ўслед за Горкамі, дзе гэты праект быў запушчаны як пілотны яшчэ 10 гадоў таму, яго актыўным удзельнікам стала Круглае. За два гады поўнамаштабнага дзеяння на тэрыторыі аграгарадка Цяцерына створана добрая база для таго, каб чалавек мог рэалізаваць свае правы на здароўе. І гэта прыйшлося даспадобы мясцовым жыхарам. У планах улад — да канца гэтага года далучыць да карыснай ініцыятывы ўсе сельсаветы раёна.

СТАР. 3

Святочны настрой



# КЕСАДЫЛЬЯ ЦІ ДРАНІК?

## У Гродне пачаў працаваць калядна-навагодні кірмаш «Зімовы фэст»

**Лакацыя на цэнтральнай гарадской плошчы адносна новая. Але за некалькі гадоў стала для гродзенцаў і гасцей горада тым месцам, куды абавязкова трэба зазірнуць напярэдадні святаў. Па-першае, каб адчуць атмасферу надыходзячых Каляд і Новага года, па-другое, набыць штосьці незвычайнае ў якасці падарунка альбо асабіста для сябе. Напрыклад, аўтара гэтых радкоў зацікавілі арыгінальныя пернікі і свечкі з натуральнага воску. Чым яшчэ здзіўляе сёлетні кірмаш у Гродне — у рэпартажы карэспандэнта «Звязды».**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

22252>

Кожны дзень – з любімай «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2023 г., — у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



# «Хочаш міру — рыхтуйся да вайны»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка абазначыў асноўныя тэмы для абмеркавання. Ён заўважыў, што сёння нельга выключаць, што супраць нашай краіны можа быць разгорнута агрэсія, прынамсі такая гатоўнасць з боку нашых суседзяў заўважная. «Ведаем, хто падштурхоўвае ў спіну ці іншую кропку цела гэтых самых суседзяў для таго, каб яны стваралі напружанасць на нашых граніцах. Таму мной было прынята рашэнне правесці праверку сіл неадкладнага рэагавання», — расказаў Прэзідэнт. Ён растлумачыў, каб «грамадства разумела», што ў арміі ёсць сілы імгненнага рэагавання. Калі раптам нешта нечаканае, то гэтыя сілы за вызначаны прамежак часу паднімаюцца па трывозе і накіроўваюцца туды, дзе існуе напружанне. Вось гэтыя сілы выпрабоўваліся па рашэнні Галоўнакамандуючага. Правяраліся два напрамкі: заходні і паўночна-заходні. Адказваў за гэта дзяржсакратар Савета Бяспекі Аляксандр Вальфовіч і ўвесь дзяржсакратарыят. «Я сапраўды ведаю, што ўсё было абсалютна закрыта, утоена. Усё было, як у ваенны час. Былі ўзняты адпаведныя падраздзяленні з пэўнай задачай», — адзначыў беларускі лідар. Па яго словах, сродкі масавай інфармацыі, а асабліва тэлебачанне, знаёмілі з ходам гэтых мерапрыемстваў. Яны ўключалі ў сябе пераправу двух падраздзяленняў праз Нёман і Бярэзіну, хуткае ўзвядзенне пантонных мастоў, якія павінны былі забяспечыць пераход часцей. Падчас праверкі таксама прыкрывалі паўднёвы напрамак. «Мяне, канешне, у гэтых прапановах, якія былі вынесены на мой разгляд, насцярожвала толькі адно з досведу маёй службы — маршы здзяйсняліся вельмі далёкія, працяглыя, больш за 100 кіламетраў. Мяне гэта напружвала, але ўсякае можа быць у вайну, і я пагадзіўся. Мы правялі трэніроўку і вучэнні сіл хуткага рэагавання ў арміі на ўсякі выпадак. Усе мы павінны вучыцца», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Другі напрамак — антытэрарыстычны. Прэзідэнт падкрэсліў, што ніхто не выключае, што знутры (што малаверагодна і немагчыма практычна) і звонку могуць уварвацца на тэрыторыю Беларусі тэрарыстычныя групы і захапіць асобныя будынкі, дзяржаўныя ўстановы ці цэлы населены пункт. І вось тут праводзіцца антытэрарыстычная аперацыя. «Мы стварылі адпаведную абстаноўку, былі задзейнічаны самыя падрыхтаваныя хлопцы, якія інсцэніравалі захоп населенага пункта або яго часткі. Дзейнічалі нашы хлопцы з сіл спецыяльных аперацый. Ім супрацьстаялі антытэрарыстычныя падраздзяленні пад кіраўніцтвам камітэта дзяржбяспекі. Антытэрарыстычны напрамак — гэта ўжо прэрагатыва не арміі, а КДБ. Але ўдзельнічаць у гэтым будуць усе. КДБ накіроўвае, арганізоўвае контртэрарыстычную аперацыю, прыцягваючы патрэбныя сродкі і сілы, — расказаў кіраўнік дзяржавы. — Мы павінны былі ўзяць пад кантроль тыя ці іншыя напрамкі, маршам выйсці, былі вызначаны месцы, куды выходзяць падраздзяленні, уступаюць у бой, адваявалі і вяртаюцца ў свае падраздзяленні».

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што на сённяшні дзень аперацыі поўнасцю завершаны і Узброеныя Сілы, і сілы спецыяльных аперацый, і спецпадраздзяленні знаходзяцца ў месцах пастаяннай дыслакацыі.

«Скажу прама, нічога не хаваючы, каб мы тут не пстрыкалі абцасамі і не крычалі ўра, — былі і недахопы. І на гэтых недахопах я хацеў, каб была засяроджана ўвага», — заявіў Прэзідэнт. Па яго словах, у выпадку ваенных дзеянняў гэтыя недахопы стануць крытычнымі, загінуць людзі, чаго дапусціць нельга.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

○ **У тэму**

## Праверкі павінны працягвацца

Аб выніках праверкі сіл і сродкаў дзяржаўнай сістэмы рэагавання на акты тэрарызму і дзейнасць незаконных узброеных фарміраванняў Прэзідэнту дакладваў **Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ.** А пасля нарады з кіраўніком дзяржавы ён сустрэўся з журналістамі. Па яго словах, сілы неадкладнага рэагавання знаходзяцца ў пастаяннай гатоўнасці выконваць задачы па прызначэнні. Перш за ўсё, для спынення агрэсіі каля граніцы Рэспублікі Беларусь. Аляксандр Вальфовіч расказаў, што ў цэлым падчас праверкі падраздзяленні са сваімі задачамі справіліся. А тое, што не атрымалася, было дэталёва разгледжана на нарадзе ў Прэзідэнта.

«Людзям у пагонах наогул ніколі нельга расслабляцца, а зыходзячы з таго становішча, якое складваецца каля нашых граніц, — тым больш. Аналізуючы дзеянні нашых суседзяў, улічваючы іх агрэсіўныя планы, захопніцкія думкі, трэба рыхтаваць нашы Узброеныя Сілы да таго, каб яны былі ў любы момант гатовы выканаць свае задачы, гарантаваць бяспеку нашай краіны. Усё, што трэба, у нас ёсць, самае галоўнае — якасна выконваць тое, што спланавана, адпрацоўваць праграму баявой падрыхтоўкі, рыхтаваць маладых людзей, маладых афіцэраў усіх сілавых структур да выканання задач па прызначэнні. Гатоўнасць выканаць задачу, перш за ўсё, заключаецца ў маральна-псіхалагічнай гатоўнасці асабовага складу. Дарэчы, гэтая праверка паказала, што нашы салдаты, маладыя афіцэры, камандзіры падраздзяленняў нацэлены, матываваны выканаць пастаўленыя задачы якасна. Бо яны разумеюць, што за спінай у іх жыццё іх дзяцей, жонак, бацькоў, яны забяспечваюць іх абарону, гарантуюць бяспеку краіны тым, што якасна выконваюць свае задачы», — адзначыў Аляксандр Вальфовіч.

Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі заўважыў, што праверка праходзіла ў складаных умовах — акурат падчас маразоў і снегападу. Спецыяльна гэта не планавалася, але супадзенне ўдалае. Аляксандр Вальфовіч растлумачыў, што людзі, накіраваныя на дэстабілізацыю абстаноўкі, людзі, якія хочуць здзейсніць акт агрэсіі, якраз і выберуць складаныя ўмовы. Вельмі няпростыя задачы стаялі перад інжынернымі часцямі. Ім трэба было навесці дзве пантонныя пераправы — праз Нёман і Бярэзіну. Калі б гэта не было зроблена аператыўна, своечасова, баявыя часці не змаглі б прыбыць на названыя рубяжы. Дзяржсакратар адзначыў, што інжынерныя часці са сваёй задачай справіліся.

«Праверкі павінны працягвацца. Перыядычна правяраючы часці, мы можам быць упэўнены, што яны выканаюць задачы, якія перад імі стаяць», — рэзюмаваў Аляксандр Вальфовіч.

## Дзяржаўная падтрымка забудоўшчыкам

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 433, якім карэкціруецца Указ № 13 ад 6 студзеня 2012 года «Аб некаторых пытаннях прадастаўлення грамадзянам дзяржаўнай падтрымкі пры будаўніцтве (рэканструкцыі) або набыцці жылых памяшканняў», паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Змяненні, у прыватнасці, датычацца грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і да 15 студзеня 2022 года атрымалі зямельныя ўчасткі для будаўніцтва жылых дамоў у малых гарадах, пасёлках гарадскога тыпу і сельскіх населеных пунктах не па месцы пастаноўкі на ўлік маючых патрэбу. Яны змогуць скарыстацца дзяржаўнай падтрымкай для ўзвядзення гэтых дамоў.

Указам таксама ўстанаўліваецца, што ў выключных выпадках з дазволу мясцовых выканаўчых камітэтаў магчыма адчужэнне зямельных участкаў, выдзеленых стаяўшым на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў грамадзянам, і (або) узведзеных на іх жылых дамоў да заканчэння 5 гадоў з дня дзяржаўнай рэгістрацыі такіх дамоў. Раней гэты тэрмін складаў 8 гадоў.

Указ уступае ў сілу з 1 студзеня 2023 года.

### Парламенцкі дзённік

## Супрацоўніцтва па ўсіх кірунках

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла сустрэчу з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Дзяржавы Палесціна ў Рэспубліцы Беларусь Ахмедам Махамедам аль-Мадбухам.**

— Упэўнена, што і ў Палесціне ведаюць Беларусь як міралюбівую краіну. Мы заўсёды падтрымлівалі імкненне Палесціны ў адстойванні сваіх нацыянальных інтарэсаў, суверэнітэту. Мы выдатна разумеем, што такое суверэнітэт і незалежнасць, і як дорага гэта каштуе — мы таксама выпрабавалі гэта на сабе. Але мы разумеем, што для народа гэта галоўнае: жыць на сваёй зямлі ў суверэннай, незалежнай дзяржаве.

Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што супрацоўніцтва можа здзяйсняцца па ўсіх кірунках, пры гэтым усе кантакты павінны выбудоўвацца на прававой аснове:

— Гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва можа развівацца абсалютна па ўсіх кірунках. Зразумела, важна дамагчыся таго, каб працавала міжурадавая камісія, на якой будуць вырашацца пытанні, якія сёння вынесены на парадак дня.

Падчас сустрэчы Наталля Качанава скіравала ўвагу на тое, што, акрамя палітычнага, эканамічнага і гуманітарнага супрацоўніцтва, важна развіваць міжпарламенцкае ўзаемадзеянне:

— Акрамя работы з нашымі калегамі, мы можам садзейнічаць у вырашэнні ўсіх пытанняў паміж нашымі краінамі. Таму яшчэ раз падкрэслю: мы з вялікай павагай ставімся да Дзяржавы Палесціна і будзем рабіць усё для таго, каб наша супрацоўніцтва выйшла на новы віток, — рэзюмавала Старшыня Савета Рэспублікі.

**Арына КАРПОВІЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Японіі заклікалі ЗША прызнаць бамбардзіроўкі Хірасімы і Нагасакі памылкай



Дэпутат верхняй палаты японскага парламента Мунэа Судзукі ў сваім блогу заклікаў амерыканскі ўрад сумленна заявіць Японіі і ўсяму свету, што атамныя бамбардзіроўкі Хірасімы і Нагасакі былі памылкай, паведаміла РІА «Навіны». «Нягледзячы на тое, што з канца вайны прайшло ўжо 77 гадоў, ЗША, якія скінулі атамныя бомбы, не папрасілі прабачэння. Гэта краіна, якая гучна гаворыць аб «дэмакратыі, правах чалавека і свабодзе» пра дзеянні іншых дзяржаў», — адзначыў палітык. Так ён пракаменціраваў публікацыі японскіх СМІ аб узгадненні магчымага візіту прэзідэнта ЗША Джо Байдэна ў Нагасакі ў маі 2023 года. Судзукі падкрэсліў, што лічыць правільным, калі паездка кіраўніка адміністрацыі ЗША ў горад усё ж адбудзецца. «Я жадаю, каб ён сказаў свету, не кажучы ўжо пра Нагасакі і Хірасіму, наступнае: «Выкарыстанне (ядзернай зброі. — **Заўв. РІА «Навіны»**) немагчыма, прымяненне атамных бомб было памылкай», — рэзюмаваў японскі дэпутат.

### Вялікабрытанія страціла з-за брэксіту $40 млрд




Страты Вялікабрытаніі ад выхаду са складу Еўрапейскага саюза дасягнулі сёлета да чэрвеня 33 мільярдаў фунтаў стэрлінгаў (каля $40 млрд). Пра гэта гаворыцца ў даследаванні Цэнтра еўрапейскіх рэформ, паведаміла ТАСС. Спецыялісты аналітычнага цэнтра разгледзелі, якой магла б быць зараз брытанская эканоміка, калі б Злучанае Каралеўства засталося членам ЕС. Паводле даных даследавання, памер ВУП Вялікабрытаніі па выніках другога квартала гэтага года апынуўся б на 5,5 працэнта большы, аб'ёмы брытанскага гандлю — на 7 працэнтаў вышэйшы, а аб'ём атрыманых інвестыцый — на 11 працэнтаў. Папярэднія ацэнкі паказвалі, што па стане на канец мінулага года брытанская эканоміка магла быць на 5,2 працэнта большай, калі б краіна засталася ў Еўрасаюзе. Па словах аўтара даклада Джона Спрынгфарда, брэксіт аказаў істотны негатыўны ўплыў на эканоміку краіны: «Ёсць адрозненне паміж тым, што палітыкі хочуць сказаць пра брэксіт, і тым, што нам паказвае статыстыка. Я думаю, што ўжо немагчыма сцвярджаць, што брэксіт не нашкодзіў эканоміцы».

### Нямецкі сацыёлаг папярэдзіў, што ФРГ рызыкуе стаць «краінай жабракоў»



Нямецкі сацыёлаг Ульрых Шнайдэр заявіў, што Германія можа стаць «краінай жабракоў» з-за скачка цэн, паведаміла выданне Focus. Сацыёлаг падкрэсліў, што неймаверны рост кошту жыцця павялічыў беднасць у Германіі. Ён тлумачыць, што людзі, якія і так былі бедныя, сталі яшчэ бяднейшымі, цяпер яны маюць яшчэ меншую пакупніцкую здольнасць і не ведаюць, як у фінансавым плане пражыць месяц. Па словах Шнайдэра, яшчэ да рэзкага росту кошту жыцця ў Германіі была рэкордная колькасць бедных — 13,8 млн чалавек. «З-за цяперашняга крызісу колькасць хатніх гаспадарак, якія, паводле статыстыкі, яшчэ не адносяцца да бедных, але ў канцы месяца застануцца ні з чым, павялічыцца больш чым на 12 мільёнаў», — расказвае ён. Шнайдэр адзначыў, што крызіс кошту жыцця можа мець драматычныя наступствы для Германіі: «Нашаму грамадству пагражае раскол».

### БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

## Выканкамы на сувязі

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 24 снежня, з 9.00 да 12.00 правядуць:

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- кіраўнік спраў Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Анатольевіч БАРАНОЎСКІ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Андрэй Вацлававіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Генадзь Іванавіч ДЗЕНГАЛЁЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Дзяніс Мікалаевіч КУРЛЕНКА. Тэл. 8 017 500 41 60;
- старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Яўгеневіч КУХАРАЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

# ПА ДОБРАЙ НАВАГОДНЯЙ ТРАДЫЦЫІ

**Акцыя «Нашы дзеці» — добрая навагодняя традыцыя, заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА ў час наведвання Гарадскога дзіцячага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі «Пралеска» ў Валожынскім раёне, перадае карэспандэнт БелТА.**



Фота БелТА.

«У нашай краіне ёсць добрая традыцыя — перад Калядамі і Новым годам ездзіць па ўсіх кутках нашай краіны, каб павіншаваць з чароўнымі зімовымі святамі дзяцей, галоўным чынам тых, хто з-за розных абставін апынуўся ў гэты час не дома. І, вядома ж, прыняць удзел у святочных мерапрыемствах, уручыць падарункі. І мяне, і ўсіх прысутных дарослых вельмі кранулі вашы песні, вершы, танцы, мы вельмі рады быць тут і разам з вамі сустракаць зімовыя святы», — сказаў Раман Галоўчанка.

Цэнтру медыцынскай рэабілітацыі ён уручыў сертыфікат на 20 тысяч рублёў для закупкі медыцынскага абсталявання, а дзецям — салодкія навагоднія падарункі. «Жадаю вам моцнага здароўя. За вамі — будучыня нашай краіны. Будзьце патрыётамі, любіце сваю Радзіму», — даў наказ дзецям кіраўнік урада.

Прэм'ер-міністр таксама азнаёміўся з работай цэнтра медыцынскай рэабілітацыі, яму прадэманстравалі медыцынскае абсталяванне, пакоі для аздараўлення і вольнага часу дзяцей. Па выніках наведвання ён адзначыў, што ў цэнтры створаны выдатныя ўмовы для таго, каб дзеці змаглі перамагчы хваробу, аднавіць здароўе.

Надвор'е

# Мокры снег з дажджом і паўсюдна слізка

**Па ідэі, у гэты час павінна быць халадней за ўсё, але... Надвор'е не падладжваецца пад каляндар. І ў канцы тыдня цёплыя паветраныя масы атлантычнага паходжання нясуць у Беларусь адліжнае надвор'е, якое захаваецца ў пятніцу і суботу, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Адносна цёпла будзе ў суботу. У гэтыя суткі ўначы і раніцай на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень месцамі па краіне прагназуюцца ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу складзе мінус 2 — плюс 3 градусы, днём — ад 0 да 4 цяпла.

Паводле інфармацыі сіноптыкаў, на каталіцкія Каляды, 25 снежня, паветраныя патокі нянадоўга зменяць свой напрамак на паўночна-заходні і тэмпературны фон у нашай краіне панізіцца. Пасля адлігі, пры паніжэнні тэмпературы паветра да мінусавых значэнняў, на дарогах чакаецца галалёдзіца. Слабы мароз будзе ў нашай краіне і ў панядзелак, а ўжо ў аўторак цёплае надвор'е зноў вернецца ў краіну.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# У ЦЯЦЕРЫНЕ ШКОДНЫМ ЗВЫЧКАМ СКАЗАЛІ «НЕ»

### ТЭРЭНКУР, КАРЫСНАЯ ЕЖА І ПРЭМІЯ ЗА АДМОВУ АД КУРЭННЯ

— Ёсць зацікаўленасць кіраўнікоў сельгаспадарак і старшынь сельсаветаў, — расказаў **галоўны санітарны ўрач Круглянскага раёна Ягор ГАЎРЫЛЕНКА.** — За кароткі тэрмін мы дасягнулі вельмі добрых вынікаў па Цяцерыне, нас адзначалі на ўзроўні вобласці, і з іншых абласцей калегі зацікавіліся. Астатнія сельсаветы пытаюцца, калі і іх падключаць да праекта. Магчыма, хутка раён цалкам будзе захоплены праектам. Патрабуецца спонсарская дапамога: дзесьці банер устанавіць, дзесьці плітку пакласці, развіць пэўныя камунікацыі. Але яно таго варта. Людзі ўбачылі, што пра іх рэальна клапоцяцца, не ўзнікае жадання з'язджаць. Цяпер у Цяцерыне шмат моладзі. Мясціны тут выдатныя: вадаёмы, лясы... Мы зрабілі экалагічны пашпарт аграгарадка.

Ягор Гаўрыленка з захапленнем расказвае, як працуе праграма «Здаровыя гарады і пасёлкі». У яе ўцягнуты ўсе суб'екты гаспадарання: школа, крамы, пошта, прадпрыемствы і арганізацыі, сацыяльная служба. У школе ўсталяваны сучасныя афтальмалагічныя трэнажоры, для прафілактыкі скаліёзу падабрана адпаведная мэбля.

— Дырэктар школы з намі на цеснай сувязі, — заўважае галоўны санітарны ўрач. — Мы даём рэкамендацыі, абмяркоўваем, які трэнажор патрэбны, дзе яго размясціць.

Як толькі Цяцерына ўключылася ў праект, у школьнай сталовай духавую печ замянілі на параканвектамат. Цяпер ежа тут больш карысная: катлета, напрыклад, не абсмажваецца, а запякаецца. Зараз вырашаецца праблема спажывання солі і цукру.

— Па выніках нашых маніторынгаў мы бачым, што дзеці перараядаюць гэтыя дабаўкі, — падзяліўся Ягор Гаўрыленка. — І гэта адбываецца не толькі ў школе. З шасці гадоў у дзяцей фарміруюцца шкодныя звычкі ў ежы. Мы пераглядаем тэхналагічныя карты, каб да мінімуму зменшыць колькасць гэтых дабавак.

У сталовай сельскагаспадарчага прадпрыемства «ААБ Агра-Цяцерына» наогул адмовіліся ад солі.

— Мы ўзгаднілі з аграгаспадаркай адпаведныя тэхналагічныя карты, зацверджаныя Саўмінам, — патлумачыў галоўны санітарны ўрач раёна. — Салянкі стаяць на стале. Калі трэба, самі пасоляць.

Прадпрыемства пайшло далёка ў выкананні рэкамендацый санслужбы. Нават унесла змяненні ў калектыўны дагавор. Калі чалавек, напрыклад, адмовіўся ад шкодных звычак, прадугледжаны бонус у выглядзе грошай або наведвання басейна. Гаспадарка зацікаўлена ў здаровых работніках, развівае спартыўны напрамак. Яе каманда пастаянна ўдзельнічае ў спартыўна-масавых мерапрыемствах і заўсёды ў лідарах.

«ААБ Агра-Цяцерына» распрацоўвае ўласныя метадыкі захавання здароўя. Санітарна-бытавыя памяшканні прыведзены ў адпаведны выгляд, ёсць гарачае водазабеспячэнне, для разагрэву ежы ўстаноўлены мікрахвалёўкі. На кантролі — медыцынскія агляды. Калі ў кагосьці выяўлена захворванне, чалавек становіцца пад нагляд у амбулаторыі па месцы жыхарства.

У крамах аграгарадка ёсць паліцы здаровага харчавання. Гэта безглютэнавыя сумесі, дыетычныя прадукты, замяняльнікі цукру і гэтак далей. Распрацаваны маршруты для заняткаў тэрэнкурам. Ёсць такая методыка аздараўлення — прагулка па мясцовасці з плаўнымі пад'ёмамі і спускамі. Распрацаваны тры маршруты ўздоўж Цяцерынскага вадасховішча. Прагуляцца, вядома, можна і па горадзе. Але калі побач машыны, то якое тут аздараўленне? А тут лес, вадаём, чыстае паветра.

— Усе маршруты пазначаны, ёсць прыпынкі з лаўкамі, — расказвае Ягор Гаўрыленка. — Хада да вадаёма і прагулкі па беразе даюць станоўчы эфект. Гэты від адпачынку карыстаецца папулярнасцю, пахадзіць па экалагічных сцяжынках прыязджаюць нават з Круглага. Там, дарэчы, ёсць гаючая крыніца і купель. Дэпутаты разам з насельніцтвам паклапаціліся добраўпарадкаваць пляцоўку і паставілі ліхтары.



Любімае месца адпачынку ў Цяцерыне.

### ЗДАРОВАЯ ШКОЛА — ЗДАРОВЫЯ ДЗЕЦІ

Цяцерынская школа ўражвае. У яе сценах фарміруецца матывацыя не толькі весці здаровы лад жыцця, але і быць патрыётам. Сенатар Аляксей Кушнарэнка дапамог абсталяваць клас ваенна-патрыятычнага выхавання па апошнім слове навукі і тэхнікі. Падпалкоўнік Сяргей Літвінюк, які займаецца ваеннай справай з вучнямі, з гонарам дэманструе памяшканне, дзе ўсе сцены і нават столь — наглядны дапаможнік па яго прадмеце.

Уздымаемся з **Уладзімірам АЛЯХНОВІЧАМ, дырэктарам школы, заслужаным работнікам адукацыі,** на другі паверх, і кожная прыступка лесвіцы нешта сімвалізуе.

— Яна называецца Лесвіцай поспеху, — удакладняе Уладзімір Адамавіч. — Бачыце, верхняя так і пазначана — «Поспех». А што для гэтага трэба? Вось кожная прыступка і расказвае. Першая — жаданне, паставіў мэту, вершы, што ўсё атрымаецца, спадзяешся, любіш тое, што робіш, адчуваеш ад гэтага шчасце і дасягаеш поспеху. А яшчэ ёсць Лесвіца здароўя. Там таксама пазначаны асноўныя пункты дасягнення мэты.

Другі год у школе існуе спартыўны клас: школьнікі любяць валейбол і лыжныя гонкі, не маюць шкодных звычак. «Усе выдатнікі, — кажа дырэктар. — Шасцёркі ў іх — рэдкасць». І вядзе ў клас, які ўвесь сёлета збіраецца паступаць у МДУ імя А. Куляшова. На маё здзіўленне дырэктар рэагуе жартам: «У нас хутка шмат настаўнікаў ідзе на пенсію — патрэбны новыя кадры». Умовы для вучобы тут выдатныя. У кабінеце рускай мовы і літаратуры, напрыклад, вялікая відэадошка. Настаўніца Тамара Скарабагатая адзначае, што так вывучаць класікаў значна прасцей.

На свае вочы ўбачыла, як арганізавана здаровае харчаванне дзяцей. Дырэктар школы паказаў, дзе захоўваецца стратэгічны запас вітамінаў, сабраных на школьных градках. Капуста, морква, цыбуля і ўсё астатняе з набору агародніны тут сваё. Вырошчваннем ураджаю займаюцца настаўнікі і ўсе 112 вучняў. У прасторнай сталовай таксама шмат напамінаў пра здаровую ежу.

— Харчаванне, фізкультура і выхаванне — нашы галоўныя інструменты, — кажа **намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Анастасія ЛЕМЕШАВА.** — Сталі больш актыўна праводзіць тлумачальную работу па здаровым харчаванні з бацькамі. У школе ўсё пралічвае тэхнолаг, а дома мы не заўсёды гэта робім. Тое ж самае і з зарадкай. З яе пачынаюцца ўрокі. У нас ёсць тэнісныя і більярдныя сталы, спартзала, якая працуе і ў вячэрні час, стадыён. 16 гадоў запар мы ў спартакіядзе раёна былі першыя ў сваёй катэгорыі, упершыню сёлета аддалі кубак Комсенічам. Але абяцаем, што хутка яго вернем. Шмат праводзім работы па прафілактыцы шкоднай залежнасці, ладзім канферэнцыі, дзе дзеці расказваюць аднагодкам, як важна быць здаровым, самі гаворым пра гэта на бацькоўскіх сходах. У нас створана выдатнае адукацыйнае асяроддзе. І, ведаеце, ёсць плён — колькасць першакласнікаў у аграгарадку расце!

### ЗА СПРАВУ ЎЗЯЛІСЯ ДЭПУТАТЫ

Народныя абраннікі першымі ўключыліся ў работу па прапагандзе здаровага ладу жыцця. Без іх прыцягнуць цецераўчан, у тым ліку пенсіянераў, было б складана. **Старшыня Круглянскага райсавета Сяргей ХРАМЦОЎ** паказаў крыніцы, якія адрадзілі дэпутаты разам з насельніцтвам. Адна з іх побач з Цяцерынскай школай.

— Калісьці яна была крыніцай пітной вады для школы. На ёй гатавалі ежу, карысталіся для бытавых патрэб, — кажа ён. — Калі з'явіўся водаправод, крыніца прыйшла ў заняпад. У 2019 годзе вырашылі яе аднавіць. Прыбралі паваленыя дрэвы, зрабілі масткі. Экскаватар працаваў два дні. Затое бачыце, які чысты сподак крынічнага азярца атрымаўся! З яго вада ручайком бяжыць у Друць.

Побач з вадаёмам сцяжынкі здароўя, непадалёк нядаўна пасаджаны ельнік. Усё прыгожа і гарманічна звязана. Школьны стадыён непадалёк.

— Мы заўсёды на вышыні па спартыўных паказчыках і добраўпарадкаванні, — дзеліцца **старшыня Цяцерынскага сельвыканкама Надзея ЯРОМІНА.** — Летась наша зборная каманда заняла другое месца па міні-футболе, валейболе, лыжных гонках сярод працоўных калектываў раёна. А сёлета на абласных «Дажынках» у Слаўгарадзе атрымалі трактар «Беларус». Наш аграгарадок стаў пераможцам рэспубліканскага агляду-конкурсу па землекарыстанні і добраўпарадкаванні.

**Намеснік старшыні Круглянскага райвыканкама Анжэла ЛУКАШЭВІЧ** падсумоўвае:

— Здаровы лад жыцця на слыху ва ўсіх. Усе раёны падключаны да праекта, але найбольш актыўныя Горкі і мы. Праект «Здаровыя гарады і пасёлкі» аб'ядноўвае і дэмаграфію, і адукацыю, і ахову здароўя, і сацыяльную абарону, і выратавальныя службы, і праваахоўныя органы. Гэта заахвочванне пазбавіцца ад шкодных звычак, вакцынацыя, маніторынг здароўя, прафілактыка пажараў, дэвіянтных паводзін... Разам мы дапамагаем людзям заставацца здаровымі і актыўнымі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

*г. Круглае.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# КЕСАДЫЛЬЯ ЦІ ДРАНІК?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Трэба сказаць, што плошча Савецкая — традыцыйнае месца гродзенскіх фэстаў. Нездарма яна некалі называлася Рыначнай. Бойкае гэта месца і цяпер. Асабліва падчас вялікіх святаў, такіх як Вялікдзень і Каляды. Праўда, раней сваю прадукцыю прапанавалі гандлёвыя прадпрыемствы горада і вобласці. Зараз фармат змяніўся, стаў падобны да еўрапейскага фудкорта. Па словах адміністратара кірмашу Анастасіі, трансфармавалася і размяшчэнне павільёнаў. Арганізатары адмовіліся ад другога рада, які наведвальнікі папросту міналі. Таму сёлета павільёны размешчаны ў адну лінію з абодвух бакоў, у цэнтры — імправізаваныя сталы-бочкі. З'явілася некалькі новых удзельнікаў.



Гандлёвыя рады месцяцца ў прыгожа аформленых і ззяючых павільёнах, ежа гатуецца на месцы. Аб перавагах пакупнікоў Анастасія гаворыць так: «Людзі, мабыць, доўгі час не могуць выязджаць на шашлыкі, таму гэты прадукт карыстаецца попытам. Добра разыходзіцца ў такое надвор'е глінтвейн, і традыцыйна многія аддаюць перавагу бульбе фры, дранікам».

Упершыню тут прысутнічае мексіканская кухня. Прапануюць пакаштаваць бурыта з куранём ці ялавічынай або яго вегетарыянскі аналаг. Гатуюць кесадыллю — традыцыйную мексіканскую закуску са складзенай тонкай ляпёшкі з начыннем. Можна таксама ацаніць смак мексіканскага супу. Кошт страў ад 6 да 12 рублёў. Прапанаваныя тут і іншыя кухні. У меню аднаго з фудтрэкаў бульба па-бельгійску з каўбаскамі, нагетсамі, крэветкамі ці сырам. У залежнасці ад выбару цана вагаецца ад 11 да 16 рублёў, за 250 грамаў бульбы — 7 рублёў.

Гаспадыня аднаго з фудтрэкаў, Маша, прапануе чэшскія трдэльнікі. Гэта трубачка з дражджавога цеста з рознымі напаўняльнікамі. У Гродне раней такой выпечкі не было. Сярод дзяцей найбольш папулярная з крэмам нутэла. Ёсць ванільны крэм, узбітыя вяршкі. З напаўняльнікам каштуе 6,5—7 рублёў.

Адна з самых вялікіх лакацый належыць Гродзенскаму мясакамбінату. Гандлёвы павільён уяўляе сабой прыгожы драўляны вагон з зонай для перакусу. Модульнае кафэ абсталявана цеплавымі пушкамі. Тут можна даволі сытна падсілкавацца. Вось і цяпер на вялікай жароўні гатуецца порцыя барбекю. Кухар Артур кажа, што мясныя далікатэсы разыходзяцца добра, у трэндзе любімыя ўсімі шашлыкі. Таксама прапануюцца запечаныя рулькі, рабрынкі, каўбаскі і шкваркі. Тут гатовы карміць наведвальнікаў да позняга вечара, у святы вулічнае кафэ працуе да 21-22 гадзін. Артур наракае на надвор'е: «Толькі што быў мароз — на табе, другі дзень запар церусіць дробны дождж. Але мы ўсё роўна гатуем і вытрымліваем асартымент».

Што датычыцца кошту, ён даволі прымальны. Каўбаскі на грылі — 3,5 рубля, плоў і рабрынкі — па 4 рублі, сто грам шашлыку са свініны каштуе 6 рублёў, з курыцы — 5.

Усяго размешчана 10 аб'ектаў хуткага харчавання.

Каля павільёна з экзатычнымі чаямі і пернікамі невялікая чарга. Пакупніцы выбіраюць, удакладняюць, распытваюць аб якасцях і саставе тавару. Да наведвальнікаў гаспадар павільёна ставіцца вельмі ўважліва. Карэспандэнту «Звязды» ён расказаў, што яго завуць Павел, прыехаў са сваім таварам з расійскага Ніжняга Ноўгарада. Знакавай прадукцыяй лічыць пернікі, якія распісваюцца прафесійнымі мастакамі.













— Мы ездзім па ўсім свеце і на кірмашах прапануем сваю прадукцыю. Гродзенцы таксама вельмі актыўна набываюць нашы тавары, тым больш што пернікі з навагодняй і каляднай тэматыкай. Некаторыя вяртаюцца па іх некалькі разоў. Можна сабраць арыгінальныя падарункі, якія здольны парадаваць кожнага. На вітрыне ўжо засталося не так многа, чакаем машыну, якая падвязе чарговую партыю. Ідуць нарасхват, — паведаміў прадстаўнік расійскага гандлёвага прадпрыемства.

Як тут утрымацца і не набыць цудоўныя калядныя пернікі, якія, па словах Паўла, могуць захоўвацца некалькі месяцаў з-за іх прыродных кансервантаў — мёду, імбіру, карыцы. Думаю, што змагу парадаваць сваіх сямейнікаў падчас святаў. Кошт аднаго перніка ў сярэднім ад 6 да 8 рублёў. Але ёсць і таннейшыя.

Месца на кірмашы замовілі і пчаляры з Брэста. Пакуль гаспадыня размаўляе з пакупнікамі, стараюся вызначыць, што мяне цікавіць у гэтым мядовым царстве. Сапраўды, асартымент вялікі. Мёд з рознымі дабаўкамі — маліны, буякоў, журавін, імбіру, абляпіхі. Сфарміраваны і гатовыя падарункі коштам ад 30 да 60 рублёў: мёд розных відаў, арэхі ў мёдзе, крэм-мёд, васковыя свечкі. «Вельмі карысныя і смачныя падарункі», — заўважае гаспадыня Зоя Аляксандраўна.

Спыняюся на вітых васковых свечках. Ёсць розныя формы і памеры — у выглядзе елачак, геаметрычных фігур, жывёл, анёлаў. Таксама трымаю ў памяці ідэю «мядовага» падарунка.

— Усе вырабы з нашай уласнай пасекі, — зазначае Зоя Аляксандраўна. — Гродна выбралі для ўдзелу ў кірмашы невыпадкова, тут жыве наша дачка і нам ёсць дзе спыніцца, бо кірмаш даволі працяглы па часе — ён доўжыцца амаль месяц.

Аматары слодычы не будуць расчараваны. Асобны павільён прапануе даволі шырокі выбар берлінераў з розным начыннем. Аляксандр, які прадстаўляе вытворчае прадпрыемства, расказаў, што пякуць іх з чатырох гадзін раніцы. Гатуюць невялікімі порцыямі цягам дня. Такім чынам, у продаж увесь час паступае свежая партыя, якая падвозіцца па меры рэалізацыі. Усяго ў асартыменце прадпрыемства каля 60 розных відаў начыння. Можна ацаніць вішню з кіслінкай, банан пад шакаладам, а таксама новы від — яблык з карыцай і карамеллю. Пытаюся, наколькі папулярны сярод гродзенцаў гэты від пончыкаў.

— Калі мы некалькі гадоў таму прыйшлі ў Гродна з гэтай ідэяй, такі прадукт тут ужо быў. Але мы першыя, хто ўнеслі цэлы шэраг змяненняў. Напрыклад, дабаўляем розныя глазуры, што робіць пончык больш цікавым і смачнейшым, — адказвае Аляксандр.

За перакусам заспяваю валанцёра з Мінска Любоў Міхайленку. Яна расказала, што прыехала ў Гродна ў складзе дэлегацыі ў рамках дабрачыннай акцыі па зборы сродкаў для хворых дзетак. Перад вечарынай дзяўчына завітала на калядны кірмаш, каб падсілкавацца. Кажа, што вулічныя фудтрэкі вельмі выручаюць, калі не хапае часу. Прытым можна паабедаць якаснай гарачай ежай і пітвом.

Маці і дачка прыехалі з Гродзенскага раёна па падарункі і вырашылі адзначыць свае пакупкі кубачкам глінтвейну. Яго гатуюць на віне, піве і роме. Па словах суразмоўніц, глінтвейн ім спадабаўся, дапамог сагрэцца. Некаторыя забягаюць сюды, каб выпіць гарбаты ці кавы. Можна знайсці і гарачы шакалад. Кошт напіткаў ад 4 да 6 рублёў.

На «Зімовым фэсце» ў Гродне прадаюць сувенірную прадукцыю ручной работы. Напрыклад, упрыгажэнні, прадметы для дома, вязаныя і ёлачныя цацкі. Іх кошт ад 5 да 50 рублёў. Прыгожа аформлены калядны вянок каштуе 60 рублёў.

Ёсць тут і розныя забавы для дзяцей і дарослых. Можна пакатацца на каруселі, зайсці ў цір альбо заказаць паездку на поні за 10 рублёў.

«Зімовы фэст» прадоўжыцца да 8 студзеня з 15 гадзін да 23. Дарэчы, у навагоднюю ноч на плошчы Савецкай разгорнецца канцэртнае шоу. Фудтрэкі будуць працаваць з часу ночы да чатырох гадзін раніцы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

Хутка прэм'ера

# ВЯДОМЫЯ ІМЁНЫ ШОУ «ФАКТАР.BY 60+»




**Пакуль гледачы «Фактар.BY», што заваёўвае гучныя рэйтынгі на тэлеканале «Беларусь 1», вырашаюць лёс маладых удзельнікаў другога сезона. А паралельна ідзе падрыхтоўка да не менш вялікай прэм'еры. І творчая група Белтэлерадыёкампаніі раскрыла адну з галоўных таямніц праекта «Фактар.BY 60+».**

У той час як на «Фактар. BY» працягваецца самая хвалюючая і непрадказальная барацьба паміж фіналістамі праекта, творчая каманда медыяхолдынга рыхтуе яшчэ адзін падарунак для аматараў музыкі — душэўнае і па-сапраўднаму сямейнае шоу «Фактар.BY 60+». Яго галоўнымі героямі стануць людзі ўзросту нашых бацькоў, дзядуляў і бабуль — усе тыя, хто захаваў у сэрцы любоў да песні і гатовыя заявіць пра гэта на ўсю краіну.

Канкурсанты выступяць на вачах вялікай тэлевізійнай і інтэрнэт-аўдыторыі, а таксама аўтарытэтных настаўнікаў і на ўласным прыкладзе дакажуць, што сцэну можна пакарыць у любым узросце. А прафесійную ацэнку артыстычнаму майстэрству ўдзельнікаў дадуць мэтры — вядомы тэле- і радыёвядучы і акцёр Уладзімір Бярэзін і артысты беларускай эстрады Вікторыя Алешка, Аляксандр Саладуха і Аляксандра Гайдук. Вядучымі шоу талентаў на сцэне і за кулісамі стануць Алена Спірыдовіч і Павел Лазовік.

Прэм'ера праекта «Фактар.BY 60+» запланавана на тэлеканале «Беларусь 1» у лютым будучага года адразу пасля заканчэння «маладзёжнай» версіі шоу. Усю актуальную інфармацыю і падрабязнасці можна знайсці на сайце Белтэлерадыёкампаніі www.tvr.by ці адсочваць у тэлеэфірах і на каналах Беларускага радыё, а таксама ў тэлеграм-канале Агенцтва тэленавін ATN_NEWS.

**Алена ДРАПКО.**

**Фота дадзена Белтэлерадыёкампаніяй.**

# ШАШКІ

**(«Звязда»)** Выпуск № 181

Міжнародны гросмайстар Андрэй Валюк выйграў сярэбраны медаль на традыцыйных спаборніцтвах па шашках-64 «Мемарыял В. А. Сокава», якія адбыўся з 4 да 11 снежня ў Санкт-Пецярбургу (Расія).

№ 175



**№ 175 Ю. Мурадаў (Барысаў)**

**Белыя простыя:** e1, g1, d2, f2, g3, a5, e5, d6 (8)

**Чорныя простыя:** b2, c3, b4, d4, g5, f6, g7, b8, f8 (9)

У шашкі-100 праблемы склаў міжнародны гросмайстар па шашачнай кампазіцыі Валдас Бяляўскас (Літва).

№ 176

**Белыя простыя:** 36, 33, 27, 28, 29, 22, 23, 19 (8)

**Чорныя простыя:** 40, 31, 34, 17, 11, 12, 8, 9 (8)

№ 177

**Белыя простыя:** 42, 40, 33, 28, 29, 23, 14 (7)

**Чорныя простыя:** 45, 31, 34, 11, 13, 7, 8 (7)

№ 178

**Белыя простыя:** 43, 32, 27, 28, 18, 19, 20 (7)

**Чорныя простыя:** 41, 44, 37, 17, 15, 7, 9 (7)

Дзве наступныя пазіцыі складзены па правілах бразільскіх шашак вядучым аддзела.

№ 179

**Белыя простыя:** g1, d2, h2, e3, g5, h6 (6)

**Чорныя простыя:** h4, a5, c5, e5, a7, e7 (6)

№ 180

**Белыя простыя:** g1, d2, f2, f4, h4, a7 (6)

**Чорныя простыя:** b2, b4, d4, e5, d6, d8 (6)

№ 181

**Белыя простыя:** b2, d2, f2, b4, f4, b6 (6)

**Чорныя простыя:** d4, e5, d6, h6, b8 (5)

Пайшоў з жыцця майстар спорту па шашачнай кампазіцыі Аляксандр Аляксандравіч Разанка (02.02.1951—14.12.2022). Ён выйграваў сярэбраны медаль чэмпіянату СССР у раздзеле задач. У 1982 г. быў чэмпіёнам БССР у раздзеле праблемы-100 і сярэбраным прызёрам у раздзеле задачы-100. Апошнія дзесяцігоддзі актыўна ўдзельнічаў у суддзействе чэмпіянатаў і конкурсаў па шашачнай кампазіцыі, лічыўся экспертам у задачным жанры. Захапляўся крыжаванкамі, удзельнічаў у міжнародных конкурсах. Сённяшнія кампазіцыі прысвячаюцца яго памяці.

Анонс: З 24 да 27 снежня ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках (г. Мінск, вул. Маркса, 10) пройдзе Кубак Рэспублікі Беларусь па шашках-64 (склад каманды 3+1) і шашках-100 (склад каманды 2+1).

**Праверце свае рашэнні**

**Выпуск № 180 ад 09.12.2022.**

№ 168 1. d4-e5 f4:d6 2. b4-c5 d6:b4 3. b6-c7 d8:b6 4. a7:e3 h4-g3 5. f6-e7 f8:d6 6. e3-f4 g3:e5 7. h6-g7 e5-f4 8. g7-f8 d6-e5 9. f8-g7 e5-d4 10. g7:c3 f4-g3 11. c3-d4 g3-h2 12. d4-g1+

№ 169 1. c1-d2 b6:b2 2. d2-e3 a3:c5 3. e3-f4 g5:e3 4. f2:a1 h4:f2 5. g1:e3 a7-b6 6. e3-d4 b6-a5 7. d4-e5 a5-b4 8. e5-d6 b4-a3 9. d6-e7 f8:d6 10. a1-c3+

№ 170

1. d4-c5 b6:b2 2. b4-c5 d6:b4 3. f4:f8 h2:f4 4. f8:e7 d8:f6 5. e1-d2+

№164 1. c7-d8 a5:c3 2. c5-b6 a7:e7 3. d8:b4 f4:d6 4. b4:e7 f8:d6 5. h6:c1+

№ 171 1. c3-d4 f6-e5 2. f4:b4 a5:e5 3. e3-f4 e5:g3 4. h4:f2 b6-c5 5. f2-e3 c5-b4 6. e3-d4 b4-c3 7. d4:b2+

№ 172 1. f4-g5 h6:f4 2. e3:e7 c5:g1 3. e7:a7 g1-d4 4. d2-e3 d4:g1 5. a7-b8 g1-d4 6. e1-f2 d4:g1 7. b8-a7 h8-g7 8. h4-g5 g7-h6 9. g5-f6 g1-d4 10. a7:g1+

№ 173 1. 32-28 22:42 2. 43-38 36:47 3. 49-43 42:33 4.46-41 47:36 5. 27-22 36:49 6. 22:02 16:27 7. 02:44 49:40 8. 45:34+

№ 174 1. 38-32 27:38 2. 43:41 36:47 3. 46-41 47:36 4. 23-18 36:13 5. 17-12 07:18 6. 28-23 19:28 7. 30:08 03:12 8. 33:24 35-40 9. 39-34 40-45 10. 24-19 14:23 11. 29:07 45-50 12. 07-01 16-21 13. 26:17 50:11 14. 49-44 11:50 15. 01-06+

Першымі дакладныя адказы даслалі: С. Рашэцін (Ашмяны), С. Бурко (Орша), В.Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), У. В. Дударэвіч (в. Новая Мыш, Баранавіцкі р-н, Брэсцкая вобл.), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі (усе Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), У. Ваўчкоў (Маладзечна).

**Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013;**

**e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**







Сядзі і глядзі

# БЕЗ ПРАВА НА ПАМЫЛКУ

Другі сезон папулярнага шоу «Фактар.BY» у самым разгары: увазе гледачоў прапанаваныя штотыднёвыя прамыя эфіры, падчас якіх канкурсанты выконваюць песні розных эпох. Арганізатары і рэжысёры-пастаноўшчыкі смела эксперыментуюць з вобразамі ўдзельнікаў. Напрыклад, можна ўбачыць, як Аліса з Краіны цудаў спявае песню «Я сошла с ума» гурта «Тату». Кожны конкурсны дзень нясе мноства нечаканасцяў: сказваецца і хваляванне ўдзельнікаў, і ўзровень падрыхтоўкі да музычнага нумара, і, зразумела, тое, што ўсё адбываецца ў прамым эфіры — права на памылку няма.

Канцэпцыя шоу засталася ранейшай: чатыры зорныя настаўнікі падбіраюць сабе падапечных і на працягу ўсяго конкурсу курыруюць маладых выканаўцаў, даюць парады і дапамагаюць стварыць незабыўны нумар. У другім сезоне «Фактара.BY» настаўнікамі сталі Сяргей Саседаў, Вольга Бузава, Руслан Аляхно і Сярога. Менавіта яны выбіраюць песню, якую давядзецца спяваць канкурсанту.

— Адна з галоўных адметнасцяў другога сезона — назва, якую яшчэ ў першым сезоне трэба было зрабіць сваёй, — распавёў «Звяздзе» Руслан Аляхно. — Геаграфія «Фактара.BY» значна пашырылася: да нас прыехалі выканаўцы не толькі з Расіі, але і з Францыі. Гэта, безумоўна, робіць наш праект унікальным: людзі прыязджаюць да нас, каб раскрыць свой талент і стаць папулярнымі. Лічу, што «Фактар.BY» — шоу сусветнага ўзроўню, яно стала пляцоўкай



для таленавітай моладзі, дзе можна прадэманстраваць свой патэнцыял.

Лёс канкурсантаў вырашаюць гледачы, менавіта яны падчас прамых эфіраў выбіраюць найлепшага праз СМС-галасаванне. А калі большасць з іх вырашыць, што ўдзельнік выступіў слаба — выканаўца сыходзіць з шоу. Блогер праекта, суперфіналістка мінулага сезона Анастасія Краўчанка распавяла, што сустракаецца з удзельнікамі не толькі падчас прамых эфіраў, але і прыходзіць у іншыя дні, каб падзяліцца вопытам і даць парады:

— Я дапамагаю эмацыйна закрытым канкурсантам крыху раскрыцца. Яны ўсе вельмі добрыя, матанакіраваныя, душэўныя і дружныя. Вядома, вельмі хвалююцца: увесь тыдзень у іх праходзяць рэпетыцыі, а ў пятніцу — дзень прамога эфіру. Тады ўдзельнікі сыходзяць унутр сябе, зачыняюцца ў грымёрках, але я разумею, што ім патрэбен час, каб сабрацца з сіламі. Дзякуючы дасведчанаму сцэнарысту падчас інтэрв'ю канкурсанты, самі таго не заўважаючы, успамінаюць кранальныя гісторыі са свайго жыцця.

Сапраўды, так званыя візітоўкі сталі адметнай рысай «Фактара.by». Перад выступленнем кожнага ўдзельніка гледачоў знаёмяць з гісторыяй выканаўцы, часцей за ўсё яна даволі складаная і часам трагічная. Так многім канкурсантам давялося перадолець нямала перашкод, каб дасягнуць сваёй мары. Кожны з удзельнікаў — асоба з уласнымі прынцыпамі і поглядамі на жыццё. Як адзначыў музычны крытык і сябра журы Сяргей Саседаў, апошняе рашэнне ўсё роўна застаецца за гледачом:

— Я не хачу казаць, хто з удзельнікаў лепшы: няхай вырашае наш глядач. Мы, сябры журы і арганізатары, не хочам нічога навязваць. Зразумела, мы шмат працуем з удзельнікамі, але пры гэтым сочым, каб яны адпачывалі — песня не павінна быць «запетай» у прамым эфіры. Мы імкнёмся, каб глядач атрымаў асалоду ад прагляду нашых гала-канцэртаў.

Кожную пятніцу тэлеканал «Беларусь 1» запрашае гледачоў да прагляду прамых эфіраў «Фактара.BY». Якую музычную эпоху абралі арганізатары гэтым разам і хто з удзельнікаў паедзе дадому, можна будзе даведацца 23 снежня ў 20.45. А ў выпадку, калі вы не паспелі ўбачыць шоу у прамым эфіры, усе запісы выпускаў ёсць на You-Tube канале праекта.

**Арына КАРПОВІЧ.**

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**


## «Звязда» саграває

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на I квартал або на I паўгоддзе 2023 года, запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 16 студзеня 2023 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.



Сярод падпісчыкаў будуць разыграны 7 пледаў TexRepublic Новыя ўзоры TF FN F120 а 1520/26218 (фіялетавы/бэзавы) і суперпрыз — канвектар Ballu Enzo BEC/EZMR -500. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце да 28 студзеня 2023 года.



Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 сакавіка 2023 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або на I паўгоддзе 2023 года. Пасля 31 сакавіка 2023 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні чытайце ў нумары 237 ад 6 снежня 2022 года.

**Тэлефоны для даведак: (017) 271-81-53, 311-17-40.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4265 ад 1.12.2022 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або на I паўгоддзе 2023 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

____________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ____________________
(аддзяленне сувязі)

____________ на I квартал або на I паўгоддзе 2023 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) [ ] (індэкс) ________

____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.05** Зона Х (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.40** Навіны надвор'я.
**11.00, 12.15, 18.35, 19.20 Драма «Маё чужое дзіця» (12+).**
**13.05, 15.25 Драма «Шоу пра каханне» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**20.50** «Фактар.BY».
**21.00** Панарама.
**21.45** Зразумелая палітыка.
**22.00 Серыял «След» (16+).**
**23.45** Арэна.
**0.25** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
